УДК 37.014(476)(091) "1929/1939"

*М.К. Альховік*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА ЎЛАД БССР У ГАЛІНЕ АДУКАЦЫІ (1929-1939 гг.)

У артыкуле раскрываюцца асноўныя напрамкі палітыкі ўладаў БССР па задавальненні этнакультурных патрэб насельніцтва рэспублікі ў галіне адукацыі ў перыяд бальшавізацыі нацыянальнай палітыкі (1929–1939 гг.) У азначаны перыяд па змесце і накірунках мерапрыемстваў, якія праводзіліся, выразна вылзяляюцца два этапы. На першым этапе (1929–1934 гг.) палітыка кіраўніцтва рэспублікі была накіравана на забеспячэнне карэннага насельніцтва і этнічных супольнасцяў нацыянальнымі школамі. На другім этапе (1934–1939 гг.) па указанні саюзных уладаў рэспубліканскае кіраўніцтва ажыццяўляла ліквідацыю адукацыйных устаноў этнічных супольнасцяў БССР, а таксама прымала меры, накіраваныя на пашырэнне аўдыторыі рускай школы. Аднак факт захавання пераважнай колькасці беларускіх школ у 1939 г. не дае магчымасці ахарактарызаваць палітыку кіраўніцтва рэспублікі як адназначна русіфікатарскую.

## Уводзіны

Нацыянальная палітыка ў галіне адукацыі пасля 1929 г. фактычна не адлюстравана ў нацыянальнай ды замежнай гістарыяграфіі. Звычайна ў нешматлікіх публікацыях адзначаецца, што ў гэты перыяд адбываўся перавод беларускіх, яўрэйскіх, польскіх і іншых школ на рускую мову навучання, часам падаюцца фрагментарныя звесткі з архіўных крыніц альбо апублікаваных статыстычных зборнікаў. З'явіліся даследаванні нацыянальна-культурнага развіцця пэўных этнічных супольнасцей (латышоў, палякаў, яўрэяў) альбо нацыянальнай палітыкі ў некаторых рэгіёнах БССР [1; 2]. Мэта дадзенага артыкула – вызначэнне асноўных накірункаў нацыянальнай палітыкі беларускіх улад у галіне народнай адукацыі. Пытанне каранізацыі навучальных устаноў у артыкуле не разглядаецца.

## Нацыянальная адукацыйная палітыка ў 1929–1933 гг.

Камісія ЦКК УКП(б) на чале з У. Затонскім, якая працавала ў БССР у маі–чэрвені 1929 г., вызначыла, што тэмпы развіцця беларускай мовы з'яўляюцца дастатковымі для культурнага развіцця і саветызацыі беларускага насельніцтва. Працэсы беларусізацыі працягваліся, хоць і больш марудна. Сур'ёзныя недахопы ў беларусізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу ВНУ і тэхнікумаў, асабліва ва ўсходніх раёнах, былі выяўленыя ў 1930 г.

У другой палове 1920-х – пачатку 1930-х гг. у Койданаўскім (з 1932 г. Дзяржынскім) раёне адкрываліся польскія школы, а беларускія пераводзіліся на польскую мову (у 1925 г. у раёне існавала ўсяго 5 польскіх школ, у 1930 г. – 7, у 1931 г. – 32, у 1932 г. – 40). У раёне запрацавалі два польскія прафтэхвучылішчы, рабфак, сельскагаспадарчы тэхнікум, а таксама дашкольны ды жывёлагадоўчы тэхнікумы. Польскі навуковы камбінат у маёнтку Станькава рыхтаваў настаўнікаў малодшых класаў.

У беларускіх школах, дзе вучыліся дзеці каталікоў ці пэўная колькасць палякаў, выкладалася польская мова. Улада ігнаравала факт навучання беларусаў-каталікоў і неапалячанага беларускага насельніцтва ў польскіх школах і ССНУ. Частка каталіцкага насельніцтва (напрыклад, жыхары Юркавіцкага сельсавета) выступіла супраць паланізацыі, частка, спасылаючыся на дэклараваную свабоду ў выбары мовы, свядома пасылала дзяцей у польскія навучальныя ўстановы. Бацькі-каталікі па-ранейшаму блыталі рэлігію і нацыянальнасць, надавалі носьбітам беларускай мовы нізкі сацыяльны

---

Навуковы кіраўнік – П.І. Зялінскі, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

статус, хацелі, каб іх дзеці разумелі рэлігійную літаратуру на польскай мове. Польскія школы ў БССР маглі працягваць справу дарэвалюцыйных нелегальных польскіх школ. У пачатку 1933–1934 навучальнага года ў БССР існавала 289 польскіх школ, у якіх навучалася 17 664 чалавек. Калегія Наркамасветы БССР 28 студзеня 1934 г. вынесла рашэнне павялічыць лік польскіх школ па I канцэнтры да 285, па II – да 60, па III – да 10, г.зн. з 289 да 363.

У 1931/32 н.г. працавалі 262 яўрэйскія школы, у якіх вучылася 36 тыс. 500 вучняў. У 1934 г. функцыянавала 17 латышскіх школ. У 1935 г. на задавальненне адукацыйных патрэб 6,8 тыс. літоўцаў працавалі 11 пачатковых (300 вучняў) і 2 сярэднія (197 вучняў) школы [3, с. 134].

Аднак у справе асветы этнічных супольнасцей БССР існавалі праблемы. Устаноўка на штучнае павелічэнне колькасці польскіх навучальных устаноў прывяла да непрапарцыйнай забяспечанасці нацыянальных меншасцей школамі. У 1932 г. доля польскіх школ (252, ці 3,6%) перавышала адсотак польскага насельніцтва па рэспубліцы (паводле перапісу 1926 г., у БССР налічвалася 2% палякаў). У канцы 1932/33 н.г. у рэспубліцы 2% палякаў мелі 337 школ, 8,2% яўрэяў – 327, а 7,3% рускіх – 194. На яўрэйскую школу прыходзілася ў сярэднім 96 вучняў, на беларускую – 94, на рускую – 119, на польскую школу – усяго 47 (былі нават польскія школы з 15–20 вучнямі). Адсотак вучняў-палякаў сярод усіх школьнікаў рэспублікі складаў 1,78 (16 158 чалавек).

У 1930-я гг. змяншаецца колькасць яўрэяў, што паступалі ў яўрэйскія школы, бо малады чалавек, скончыўшы рускую школу, мог працягнуць сваю адукацыю ў прэстыжных ВНУ СССР, уладкавацца на прэстыжную работу. У выніку змяншэння патрэбаў яўрэйскай школы ў кваліфікаваных кадрах змяншаецца колькасць студэнтаў і набор на 1 курс яўрэйскіх аддзяленняў у ВНУ. Ужо ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. значная колькасць выпускнікоў яўрэйскіх аддзяленняў педагагічных навучальных устаноў не змагла ўладкавацца на працу ў яўрэйскія школы і была накіравана ў агульнаадукацыйныя школы з рускай ці беларускай мовамі выкладання.

У 1927–1928 гг. у Беларусі налічвалася 136 рускіх школ, у якіх навучалася 24 500 вучняў рускай нацыянальнасці, у 1928–1929 гг. – 130 школ, 1929–1930 гг. – 106, 1930–1931 гг. – 82, 1931–1932 – 84 (колькасць вучняў 13 996). У той жа час на 1 студзеня 1932 г. у БССР налічвалася 62 тыс. дзяцей школьнага ўзросту рускай нацыянальнасці. У сакавіку 1931 г. у Гомельскай акрузе ахоп школамі рускіх дзяцей склаў 26%. Аднак былі пашыраны і адваротныя выпадкі. Напрыклад, у 1931 г. у рускіх школах Гомеля навучалася 34% рускіх дзяцей, 24% – беларускіх, 38% – яўрэйскіх і 4% дзяцей іншых нацыянальнасцей. У 1934 г. школы БССР працавалі на 10 мовах нацыянальных меншасцей: яўрэйскай, рускай, польскай, латышскай, літоўскай, нямецкай, чэшскай, татарскай, асірыйскай і цыганскай [4, с. 195].

У 1933/34 н.г. у Дзяржынскім, Бягомльскім і некаторых іншых раёнах у польскія, яўрэйскія школы аддзелы нарасветы прызначалі настаўнікаў, якія не ведалі польскай мовы, і выкладанне ў гэтых школах ішло на беларускай або рускай мове. У 1934 г. у Гомелі ў сектары нацменшасцей кадры настаўнікаў і кіраўніцтва польскага аддзялення камплектаваліся толькі з беларусаў. У 1934 г. было выяўлена скарачэнне школ нацменшасцяў, асабліва рускамоўных, і адсутнасць падрыхтоўкі настаўнікаў у Мсціслаўскім, Гарадоцкім, Кармянскім, Петрыкаўскім і іншых раёнах.

**Нацыянальная палітыка ў 1933-1939 гг. у адносінах да руска- і беларускамоўнай школы**

Згортванне ранейшай нацыянальнай палітыкі ў нацыянальных рэспубліках было ажыццёўлена па ініцыятыве саюзных улад. Нацыянальная палітыка КП(б)Б была ахарактарызавана як нездавальняючая і гвалтоўная з нагоды напісання настаўнікам Сцяпу-

рам запіскі ў газету «Правда», дзе паведамлялася аб тым, што мясцовыя кіраўнікі цкуюць яго за напісанне ў сельсавет запіскі на рускай мове і карыстанне ёй у прыватным жыцці [5, с. 5–7]. Пасля «*справы Сцяпуры*» 1933 г. школьны сектар народнага камісарыята асветы абследаваў выкладанне рускай мовы ў мінскіх школах і выявіў значную вучнёўскую непаспяховасць. Праз некалькі месяцаў партыйна-дзяржаўная прапаганда абвінаваціла нацыянал-дэмакратаў у імкненні закрыць усе рускія школы на Беларусі. Снежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦК КП(б) Беларусі (1933 г.) адкрыта прызнаў наяўнасць шматлікіх фактаў невыканання партыйнымі, савецкімі і грамадскімі арганізацыямі пастаноў КП(б)Б па нацыянальным пытанні.

У 1933–1934 гг. адначасова існавалі дзве тэндэнцыі: на працяг беларусізацыі і на яе згортванне. У Старабарысаўскім тэхнікуме начальства забараніла студэнтам карыстацца ў асабістых зносінах рускай мовай і пастанавіла не адказваць на рускамоўныя звароты. Сетка беларускай школы ў 1933/34 н.г. дасягнула 15 294 камплектаў пачатковай і 5 011 класаў сярэдняй школы, у 1934/35 н.г. – адпаведна 15 685 і 6 732. У той жа час Барысаўскі беларускі педтэхнікум быў пераўтвораны ў рускі па прычыне недахопу выкладчыкаў, якія б валодалі беларускай мовай. У запалкавым тэхнікуме Гомеля выкладанне ўжо вялося на рускай мове.

З лютага па снежань 1933 г. партыйна-дзяржаўныя ўлады намерваліся прывесці колькасць рускіх школ і класаў проста ў адпаведнасць з доляй рускіх у насельніцтве рэспублікі. Было зменена кіраўніцтва Наркамасветы, кандыдат у члены ЦК КП(б)Б намеснік наркама асветы Бялуга быў выключаны з партыі за недастатковую ўвагу да развіцця рускай школы. 20 чэрвеня 1933 г. калегія Наркамасветы разглядала праект пастановы аб школах, у прыватнасці, аб сетцы рускіх школ, аднак у хуткім часе ён быў згорнуты камісіяй па «чыстцы» Наркамасветы БССР праз «апалітычнасць». Снежаньскі пленум ЦК КП(б)Б 1933 г. забараніў «механічна ўкамплектоўваць» масавыя школы, г.зн. накіроўваць яўрэяў, палякаў, беларусаў і інш. у іх нацыянальныя школы ў тых выпадках, калі школьнікі ведаюць рускую мову і жадаюць вучыцца ў рускай школе. Паводле плана, прынятага ў 1934 г. пад кіраўніцтвам наркама асветы БССР Чарнушэвіча, колькасць рускіх школ падвойвалася. Раённым партарганізацыям загадвалася правяраць работу органаў асветы БССР па забеспячэнні рускіх школ памяшканнямі, настаўнікамі, матэрыяльнай базай. Рэспубліканскае кіраўніцтва чакала дзейснай падтрымкі новага курсу на мясцовым узроўні, канстатаваўшы адсутнасць рашучых захадаў раённых уладаў (напрыклад, Уздзенскага раёна) як небяспечную тэндэнцыю, а таксама спробу мясцовых работнікаў ігнараваць рашэнні партыі і Наркамасветы (загадчык Гомельскага гарана Данільчык даў указанне дырэктарам рускіх школ кіравацца пры прыёме дзяцей паводле нацыянальнай прыналежнасці, а не ўжыванай мовы) [6, с. 137]. У сувязі з палітычнай кан'юнктурай за 1934/35 і 1936/37 н.гг. колькасць рускіх школ у Мінску павялічылася на 3, беларускіх – на 8. У 1937 г. у сталіцы налічвалася 47 школ: 25 беларускіх, 9 рускіх, 10 яўрэйскіх, 2 польскія, 1 нямецкая.

Руская мова, як агульнасаюзная, стала мовай міжнацыянальных зносін у рэспубліцы, адыгрываючы для нацыянальных меншасцей ролю, большую за ролю мовы народа, сярод якога яны жылі. У 1934 г. было ўзнята пытанне аб г.зв. шматмоўнасці ў нацыянальнай малодшай школе, у якой дзеці мусілі вучыць чатыры мовы і літаратуры: родную (з 1-га года навучання), беларускую, рускую і нямецкую (усе – з 2-га года навучання). Народны камісарыят асветы БССР звярнуўся ў Бюро ЦК КП(б)Б з прапановай вывучаць беларускую і замежную мовы ў нацыянальных школах толькі з 5-га класа.

Недахопы і пралікі ў рабоце рускіх школ вызначаліся «мэтанакіраваным палітычным шкодніцтвам». Загад наркама асветы БССР Дзьякава аб змяншэнні нагрузкі дырэктараў школ быў расцэнены як імкненне стварыць нездаровы настрой сярод настаўніцтва

і скараціць выкладанне рускай мовы. У выніку не ставала 400 настаўнікаў рускай мовы, падрыхтоўка кадраў выкладчыкаў таксама адсутнічала.

XVI з'езд КП(б)Б (1937 г.) раскрытыкаваў знаходжанне рускай мовы ў нярускіх школах дэ-факта на становішчы замежнай: нямецкай мове адводзілася 480 гадзін на год, рускай – 450 гадзін. Такая малая колькасць гадзін не дазваляла засвоіць яе так, як беларускую. Гэта перашкаджала рускім культурным уплывам, бо, паводле меркавання ўлады, выцякала з арыентацыі на капіталістычны Захад, а не на СССР. Колькасць гадавых вучэбных гадзін на рускую мову і літаратуру павялічвалася да 1720–1734 на год.

XVII з'езд КП(б)Б (1938 г.) запатрабаваў у адпаведнасці з указаннямі Сталіна і Молатава на нарадах па вышэйшай школе ўзмацніць вывучэнне рускай мовы ў ВНУ, ВТНУ і тэхнікумах. З 1933 па 1940 гг. выкладанне ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах было пераведзена на рускую мову. У лістападзе 1938 г. НКУС БССР у дакладной запісцы інфармаваў ЦК КП(б)Б аб пераводзе на рускую мову выкладання ў няпоўных сярэдніх школах працоўных калоній НКУС для непаўналетніх правапарушальнікаў.

Калі 1 верасня 1936 г. беларускія школы складалі 92% ад агульнай колькасці школ у рэспубліцы, то да 1 верасня 1939 г. іх доля знізілася да 82,5% (сярод 5 536 школ беларускіх было 4 565).

**Нацыянальная палітыка ў 1934–1939 гг. у адносінах да школ этнічных супольнасцей**

У сувязі з тым што пры правядзенні пашпартызацыі насельніцтва Дзяржынскага раёна колькасць палякаў аказалася значна меншай у параўнанні з ранейшымі дадзенымі, 24 ліпеня 1934 г. ЦК УКП(б)Б указаў беларускаму парткіраўніцтву на «няправільную палітыку і практыку» насаджэння ў раёнах і сёлах з большасцю беларускага насельніцтва польскіх школ і прымусовага навучання дзяцей на польскай мове і загадаў перагледзець сетку польскіх школ на карысць беларускіх [7, с. 115]. Менавіта з гэтага моманту распачаўся курс на асіміляцыю этнічных супольнасцей, які, у прыватнасці, прадугледжваў закрыццё іхніх адукацыйных устаноў. Аднак у 1934–1935 гг. ён яшчэ суіснаваў з папярэдняй палітыкай, накіраванай на забеспячэнне этнакультурных запатрабаванняў этнічных супольнасцей БССР. Пад асобы кантроль былі ўзяты камплектаванне нацменаўскіх школ настаўнікамі, а таксама справа будаўніцтва і рамонту школьных будынкаў. Упор пакуль рабіўся на добраахвотны выбар школьнікаў на карысць рускай мовы. У пачатку жніўня 1935 г. у Мінску быў адкрыты нацыянальны педагагічны інстытут па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для польскіх, яўрэйскіх, латышскіх і літоўскіх школ.

Для легітымацыі пераходу навучэнцаў польскіх школ у беларускія Дзяржынскі райкам інспіруе ў 1934 г. масавыя сходы і заявы вучняў і бацькоў пра немагчымасць і шкоднасць навучання дзяцей на польскай мове і жаданне іх вучыцца па-беларуску. Не прымаліся да ўвагі ні рэлігійныя патрэбы каталіцкага насельніцтва, ні мова продкаў.

Народны камісарыят асветы ў 1934 г. абмежаваў выкладанне польскай мовы ў польскіх і змешаных польска-беларускіх школах. 6 верасня 1934 г. пачалося закрыццё польскіх школ і перавод іх на беларускую мову навучання з выдачай вучням беларускіх падручнікаў. У 1934/35 н.г. было ліквідавана 129 польскіх школ, у 1935/36 н.г. – 82. Пашыраліся польска-беларускія школы, у якіх польскую мову вывучалі як прадмет, а выкладанне вялося на беларускай мове, альбо частка дзяцей вучылася на беларускай мове, частка – на польскай.

У 1935/36 і 1936/37 н.гг. польскі нацыянальны сектар Народнага камісарыята асветы БССР не аказваў ніякай дапамогі польскай школе, кіраўніцтва камісарыята садзейнічала русіфікацыі і беларусізацыі навучальнага працэсу, у польскія навучальныя ўстановы падручнікі не завозіліся, студэнты фактычна не ведалі польскай мовы. Заняпад устаноў ігнаравалі прадстаўнікі рэдакцый рэспубліканскіх СМІ («Orka», «Звязда»), кі-

раўніцтва пачатковых школ, камісарыят асветы БССР, Мінскі гаркам партыі, Камісія партыйнага кантролю БССР.

Колькасць іншых нацыянальных школ таксама змяншалася. У 1935 г. бюро Дзяржынскага раённага каміэта КП(б)Б прыняло рашэнне пра немэтазгоднасць існавання польскага рабфака ў Дзяржынску. Да 1 верасня 1936 г. у Дзяржынскім раёне засталося толькі 2 польскія школы з 50 у 1934 г. У пачатку 1936 г. у БССР дзейнічала 606 (з 6 978) пачатковых і сярэдніх школ нацыянальных меншасцей, у т.л. 213 яўрэйскіх, 180 рускіх, 135 польскіх, 26 украінскіх, 22 латышскія, 13 літоўскіх, 13 нямецкіх і інш. (існавалі таксама беларуска-польскія, беларуска-рускія, беларуска-латышскія, беларуска-яўрэйскія, школы па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод дарослых). У верасні 1936/37 н.г. у БССР функцыянавалі 196 яўрэйскіх школ, 107 польскіх, 9 літоўскіх, 10 нямецкіх, 24 украінскія, 12 латышскіх, 178 рускіх і 6 323 беларускія.

24 чэрвеня 1936 г., паводле пастановы ЦК УКП(б), у мясцовасцях, «дзе пражывалі беларусы», зачыняліся 65 пачатковых і сярэдніх польскіх школ і 23 польскія дзіцячыя садкі. Ліквідаваліся польскія аддзяленні педінстытута, інстытута нацыянальных меншасцей, рабфака БДУ, педвучэльні, Мінскі і Гомельскі дзіцячыя дамы і г.д. У сакавіку 1937 г. Віцебская і Мінская яўрэйскія педвучэльні былі зліты ў адну з прычыны нястачы выкладчыцкіх кадраў.

17 снежня 1937 г. Палітбюро ЦК УКП(б) зацвердзіла пастанову «Аб нацыянальных школах». Наркаматам асветы даручалася рэарганізаваць прызнаныя немэтазгоднымі нацыянальныя школы ў рускія, ліквідаваць нацыянальныя педтэхнікумы і г.д. У пастанове Аргбюро ЦК УКП(б) «Аб рэарганізацыі нацыянальных школ» ад 28 студзеня 1938 г. рэкамендавалася з восені 1938 г. размясціць вучняў асобных нацыянальных школ і аддзяленняў у суседніх сярэдніх рускіх школах альбо перавесці на вучэбныя планы і праграмы рускіх школ. Улетку 1938 г. газета «Октобэр» атрымала шмат пратэставых лістоў супраць беларусізацыі і закрыцця яўрэйскіх школаў, аднак да 1 верасня 1938 г. усе яўрэйскія школы былі рэарганізаваныя ў беларускія ці рускія, яўрэйскія педтэхнікумы і аддзяленне педінстытута ліквідаваліся. Яго студэнты працягвалі навучацца па агульных праграмах адпаведных факультэтаў. У канцы 1938/39 н.г. навучанне вялося толькі на беларускай і рускай мовах [8, с. 123].

**Заключэнне**

У нацыянальнай палітыцы вылучаюцца два этапы. З 1929 па 1933–1934 гг. партыйна-дзяржаўныя ўлады працягвалі – на фоне бальшавізацыі нацыянальнай палітыкі – ажыццяўляць беларусізацыю і задавальняць этнакультурныя патрэбы нацыянальных меншасцей, у т.л. у галіне адукацыі. Адным з цікавых і маладаследаваных феноменаў таго часу з'уяляецца палітыка паланізацыі беларускага каталіцкага насельніцтва. У 1933–1934 гг. нацыянальная палітыка КП(б)Б значна змянілася. Беларускія ўлады па ўказанні з Масквы ажыццяўлялі ліквідацыю адукацыйных устаноў этнічных супольнасцей БССР, а таксама рабілі захады, накіраваныя на максімальна магчымае, хоць і добраахвотнае, пашырэнне аўдыторыі рускай школы за кошт дзяцей-беларусаў, г.зн. дзейнічалі ў межах палітыкі дзвюхмоўя. Факт захавання дамінуючай колькасці беларускіх школ у 1939 г. не дае магчымасці вызначыць палітыку кіраўніцтва рэспублікі як адназначна русіфікатарскую.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Пичуков, В.П. Гомельщина многонациональная (20–30-е годы XX века) / В.П. Пичуков, М.И. Старовойтов ; Гомел. гос. ун-т ; управ. культуры Гомел. облисполкома. – Гомель : ГГУ, 1999. – 148 с.

2. Дзядзінкін, А.Л. Нацыянальная палітыка савецкай улады ў лістападзе 1917 – верасні 1939 гг. (на прыкладзе Віцебшчыны) : дыс. … канд. гіст. навук : 06.07.04 / А.Л. Дзядзінкін. – Віцебск, 2004. – 125 арк.

3. Матулайтис, Е.К. Литовцы под гнетом фашистской Польши : полит.-экон. очерк / Е.К. Матулайтис ; Акад. наук БССР, Ин-т истории. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1936. – 450 с.

4. Матэрыялы к дакладу ўрада БССР XI з’езду Советаў. Выданне кіраўніцтва спраў СНК БССР. – Менск : БДВ, 1935. – 271 с.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4П. –Вопіс 1. – Спр. 6 343.

6. Зеленкова, А.И. Гомельщина многонациональная (20–30-е го ды XX века) / А.И. Зеленкова, М.И. Старовойтов ; Гомел. гос. ун-т ; управ. культуры Гомел. облисполкома. – Гомель : ГГУ, 2000. Вып. 2. – 155 с.

7. НАРБ. – Фонд 4П. – Вопіс 1. – Спр. 10 917.

8. Кісялёў, К. Трыумф ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі / К. Кісялёў // Бальшавік Беларусі. – 1938. – № 11–12.

***Alhovik M.K.*** **The National Policy in the BSSR in Education in 1929–1939**

The article describes the main directions of the ethnocultural policy in the BSSR in education during the Bolshevization of the national policy period from 1929 till 1939. On the basis of the research we come to the conclusion that Belarusian authorities provided indigenous population and ethnic community with the national schools in 1929–1934 years. On the instructions of federal authorities the Republican leadership carried out the liquidation of the educational institutions of ethnic communities of the Byelorussian SSR, as well as taking steps to expand the audience of the Russian school by the Belarusians. However, the fact of the domination of Belarusian schools in 1939, does not allow to determine the policy leadership of the republic as a uniquely Russification.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 16.04.2012